начинает ориентироваться на социум, анализировать общие проблемы, в том числе и правовые. В конкретном случае, скорее всего, это будет не перенятие чужой оценки права, а собственное мнение, что очень важно. А вот какой будет эта оценка во многом зависит от правотворческой деятельности и работы правоприменителей.

Кроме того, важна индивидуальная работа психолога с заключенным. Он должен разобраться, каким осужденный видит себя в будущем, каким путем он будет идти к этому будущему. Действительно ли он сможет законным путем достичь желаемой цели. Необходимо также разобраться и в совершенных им преступных деяниях. Психолог должен объяснить, что он сделал неправильно и почему, ведь многие из осужденных не до конца осознают тяжесть своего деяния. Для реализации этого необходим штат сотрудников психологической службы при исправительном учреждении из расчета оптимально 1 психолог на 30–40 человек. Таким образом психологу будет возможно подобрать подход к каждому осужденному и помочь ему.

Еще одна особенность, имеющая место на сегодняшний день – лица, которые ранее были судимы, но судимость погашена, либо снята, либо же лицо было амнистировано, вновь совершая преступление, будут отбывать наказание вместе с теми, кто впервые совершил преступление. Это не совсем целесообразно, учитывая то, что осужденный мог отбывать наказание и в советские времена, где условия изоляции были не самыми лучшими. В особенности, если его правовое создание деформировано, то это может негативно повлиять на сознание других лиц, ведь человеку свойственно перенимать чужую оценку права, чужие суждения. Такую категорию осужденных стоит по возможности отделять от остальных.

В целом срок лишения свободы свыше 7–8 лет скорее всего предполагает не столько исправление, сколько банальную изоляцию. Такое количество времени, проведенное в заключении, колоссально изменяет сознание осужденного [3, с. 83]. Он уже вряд ли будет способен вернуться к нормальной жизни.

Таким образом, можем сделать вывод, что за последние 20 лет произошло достаточно много изменений условий изоляции заключенных, что способствует их исправлению и нормализации уровня правового сознания. Однако все еще необходимо совершенствовать систему исправления всеми способами в совокупности.

**Литература**

1 Лагун, Д. А. Кризис и деформация правосознания / Д. А. Лагун // Право и демократия: сб. науч. трудов. – 2015. – № 26. – С. 22–37.

2 Гуштын А. Осужденные выступили против новых правил в Витебской колонии. Правозащитник о том, что произошло [Электронный ресурс] / А. Гуштын // TUT.BY – 2019. – 22 марта. – URL: https://news.tut.by/society/630997.html – Дата доступа: 29.03.2019.

3 Трофимова, М. В. Влияние условий изоляции от общества на личность и поведение осужденных на разных этапах процесса отбывания наказания. / М. В. Трофимова // Вестник Кемеровского государственного университета. – 2019. – № 3. – С. 81–85.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**УДК 347.6**

***Н. В. Дзенісенка***

## ПАРАЎНАЛЬНА-ПРАВАВЫ АНАЛІЗ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ЗАМЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ У ГАЛІНЕ СУРАГАТНАГА МАЦЯРЫНСТВА

*У артыкуле праводзіцца параўнальны аналіз беларускага і замежнага заканадаўства ў галіне сурагатнага мацярынства. Параўнанне праводзіцца як з заканадаўствам дзяржаў – удзельніц СНД, так і з заканадаўствам краін далёкага*

*замежжа. На падставе аналізу дзяржавы падзяляюцца на 3 групы па прыкмеце існавання забароны на ажыццяўленне сурагатнага мацярынства, у тым ліку камерцыйнага. Робіцца выснова аб наяўнасці як агульных рыс, так і адрозненняў у прававым рэгуляванні сурагатнага мацярынства ў Рэспубліцы Беларусь і ў замежных краінах. На падставе праведзенага аналізу ўносяцца прапановы па ўдасканаленні беларускага заканадаўства.*

Сярод саматычных правоў чалавека адно з найважнейшых месцаў займаюць рэпрадуктыўныя правы. Тэрмін ‘рэпрадуктыўны’ паходзіць ад лацінскага ‘production’ – узнаўленне. З мэтай удасканалення прававога рэгулявання рэпрадуктыўных правоў у беларускім заканадаўстве неабходна звярнуцца да рэгламентацыі дадзеных правоў у заканадаўстве замежных дзяржаў. Разгледзім, якім чынам рэгулюецца працэдура сурагатнага мацярынства ў іншых краінах.

Для пачатку вызначым што, уадпаведнасці з Законам Рэспублiцы Беларусь «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» (далей – Закон аб ДРТ), сурагатнае мацярынства – від дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, які заключаецца ў злучэнні сперматазоіда і яйцаклеткі, узятай з арганізма генетычнай маці, або донарскай яйцаклеткі па-за арганізмам жанчыны, развіцці эмбрыёна, які ўтварыўся ў выніку гэтага злучэння, далейшым пераносе дадзенага эмбрыёна ў матку сурагатнай маці, выношванні і нараджэнні ёю дзіцяці.

Нацыянальная прававая база ў галіне сурагатнага мацярынства вельмі разнастайная. Пераважна нормы, якія рэгулююць гэты від дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, замацаваны ў кодэксах або галіновых актах заканадаўства [1, с. 46].

Што тычыцца дзяржаў – удзельніц СНД, то заканадаўства па пытанні сурагатнага мацярынства гэтых краін шмат у чым падобнае. Аднак варта адзначыць вельмі важнае адрозненне паміж прававым рэгуляваннем сурагатнага мацярынства ў Рэспубліцы Беларусь і ў Расійскай Федэрацыі. Паводле пункта 4 артыкула 51 Сямейнага кодэкса Расійскай Федэрацыі патэнцыяльныя бацькі могуць быць запісаныя бацькамі дзіцяці толькі са згоды жанчыны, якая нарадзіла дзіця (сурагатнай маці) [2]. Аналагічны падыход змяшчаецца і ў Федэральным законе Расійскай Федэрацыі ад 21 лістапада 2011 года «Аб асновах аховы здароўя грамадзян у Расійскай Федэрацыі». Безапеляцыйная наяўнасць абавязковай згоды сурагатнай маці не адпавядае не толькі сутнасці самога тэрміна, але і яго мэтаваму прызначэнню.

Пунктам 1 артыкула 59 Кодэкса Рэспублікі Казахстан «Аб шлюбе і сям'і» прадугледжана, што бацькамі дзіцяці, якое нарадзілася на падставе дагавора сурагатнага мацярынства, прызнаюцца муж і жонка (заказчыкі). Гэтае палажэнне аналагічнае нормам беларускага заканадаўства, што, як мы ўжо адзначалі, з'яўляецца станоўчай тэндэнцыяй прававога рэгулявання сурагатнага мацярынства.

Аднак у частцы трэцяй пункта 3 вышэйуказанага артыкула прадугледжана магчымасць адмовы ад дзіцяці мужам і жонкай (заказчыкамі). Пры гэтым права на мацярынства са згоды сурагатнай маці захоўваецца за ёй, а ў выпадку яе адмовы дзіця перадаецца пад апеку дзяржавы [3]. Такое палажэнне адсутнічае ў беларускім заканадаўстве, аднак, на наш погляд, увядзенне такой нормы паспрыяла б урэгуляванню адносін паміж заказчыкамі і сурагатнай маці ў выпадку адмовы заказчыкаў ад дзіцяці.

Такім чынам, вопыт прававога рэгулявання сурагатнага мацярынства ў Рэспубліцы Казахстан, на наш погляд, з'яўляецца больш эфектыўным і можа быць улічаны заканадаўцам пры ўдасканаленні беларускага заканадаўства аб сурагатным мацярынстве.

Што тычыцца дзяржаў, якія не ўваходзяць у СНД, то зыходзячы з аналізу нацыянальнага заканадаўства іх можна падзяліць на тры групы:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- дзе сурагатнае мацярынства, у тым ліку камерцыйнае, заканадаўча дазволена (ЗША (у частцы штатаў), Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка);

- дзе дазволена некамерцыйнае сурагатнае мацярынства (Аўстралія, Вялікабрытанія, Данія (з сур'ёзнымі абмежаваннямі), Ізраіль, Іспанія, Канада, Нідэрланды (забаронена рэклама сурагатнага мацярынства, прапанова паслуг сурагатных маці і іх падбор), у асобных штатах ЗША (Нью-Гэмпшыр, Вірджынія);

- дзе сурагатнае мацярынства афіцыйна забаронена (Аўстрыя, Германія (прычым пакаранне нясуць лекары і пасярэднікі, а не бацькі і сурагатная маці), Італія, Нарвегія, Швецыя, асобныя штаты ЗША, Францыя) [4].

Сусветным цэнтрам сурагатнага камерцыйнага мацярынства лічыцца штат Каліфорнія. У 1992 г. заканадаўчы орган Каліфорніі прыйшоў да высновы аб тым, што кантракты на выкананне паслугі сурагатнага мацярынства не супярэчаць грамадскай свядомасці, і таму прыняў законапраект аб дазволе сурагатнага мацярынства на камерцыйных пачатках. Усе правы ў адносінах да дзіцяці, народжанага з дапамогай сурагатнай маці, належаць генетычным бацькам [5, с. 6].

Супрацьлеглага пункту гледжання ў дачыненні да камерцыялізацыі сурагатнага мацярынства прытрымліваецца заканадаўства аб сурагатным мацярынстве штата Вірджынія (ЗША), якое ўступіла ў сілу з 1 ліпеня 1993 г., дзе дагаворы сурагатнага мацярынства прызнаюцца сапраўднымі пры наяўнасці дакладных умоваў: неабходна, каб сурагатная маці была замужам і мела дзяцей; муж сурагатнай маці павінен прымаць удзел у заключэнні дагавора; жанчына, якая жадае заключыць такі дагавор, самастойна не можа вынасіць і нарадзіць дзіця; па меншай меры, адзін з патэнцыяльных бацькоў з'яўляецца донарам генетычнага матэрыялу.

У дадзеным выпадку мы бачым падобныя з беларускім заканадаўствам рысы ў рэгуляванні працэдуры сурагатнага мацярынства. Аднак, згодна з беларускім заканадаўствам, муж сурагатнай маці не з'яўляецца бокам дагавора. Неабходна толькі згода мужа на яго заключэнне.

Згодна з заканадаўствам штата Вірджынія, дагавор аб сурагатным мацярынстве заключаецца ў судзе, па добрай волі, а яго змест павінен быць зразумелы бакам. Адначасова прызначаецца апякун, які павінен прадстаўляць інтарэсы дзіцяці да моманту перадачы яго заказчыкам [6, с. 55].

Аналіз прымянення сурагатнага мацярынства ў замежных краінах сведчыць аб тым, што праблемы ў названай сферы выкліканы катэгарычнай пазіцыяй краін па гэтым пытанні або несвоечасовым адэкватным прававым рэгуляваннем. Да прыкладу, у 2002 г. Вярхоўным судом Індыі было легалізавана камерцыйнае сурагатнае мацярынства ў мэтах стымулявання медыцынскага турызму. Індыя хацела стварыць сабе рэпутацыю міжнароднага сурагатнага мацерыка Мекі, падаючы якасную медыцынскую дапамогу па нізкай цане і забяспечваючы найбольш поўную юрыдычную абарону для магчымых бацькоў. Вялікі попыт на сурагатнае мацярынства ў Індыі выклікаў праблемы, у тым лікупраблемы правоў дзіцяці [7, p. 129].

Пасля таго як у 2013 г. у Індыі ўсталявалі забарону на доступ да сурагатнага мацярынства нежанатым і аднаполым парам, адзінокім людзям, папулярным месцам стаў Тайланд.

Да нядаўняга часу ў Тайландзе адсутнічалі законы, якія рэгулююць сурагатнае мацярынства. Патрэба ў заканадаўстве атрымала шырокае прызнанне, калі ў лютым 2010 года паліцыя арыштавала тайваньскае пасрэдніцкае агенцтва пад назвай Baby 101, размешчанае ў Бангкоку. Яно трымала пад замком 15 в'етнамскіх жанчын, якія былі прададзены, каб нараджаць дзяцей замежным кліентам. У 2010 г. прынялі закон, які забараняе камерцыйнае сурагатнае мацярынства. Ён быў ухвалены тайскім урадам, але заставаўся неразгледжаным нацыянальнай асамблеяй. Таму камерцыйнае сурагатнае мацярынства заставалася юрыдычна неадназначным, што дазволіла працягнуць камерцыялізацыю рэпрадукцыі трэцяга бока. Пасля прэцэдэнту па вяртанні



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грамадзянінам Аўстраліі аднаго з блізнят сурагатнай маці ў лютым 2015 г. выдаецца закон, згодна з якім толькі жанатыя тайскія пары ці пары з адным тайскім партнёрам, якія пажаніліся не менш за тры гады таму, могуць шукаць сурагатную маці на альтруістычнай аснове, а камерцыйнае сурагатнае мацярынства цалкам забаранілі, за яго прадугледзелі пакаранне да 10 гадоў турмы [8, p. 11, 12].

У краінах, дзе адсутнічае паўнавартаснае рэпрадуктыўнае заканадаўства, дзяржава назірае за сітуацыяй праз агенцтвы, у якія клінікі накіроўваюць свае справаздачы. Напрыклад, Японія і Філіпіны даюць справаздачу праз нацыянальныя таварыствы акушэрства і гінекалогіі, Сінгапур – праз Міністэрства аховы здароўя [9].

Можна зрабіць выснову аб тым, што існуюць як агульныя рысы, так і адрозненні ў рэгламентацыі рэпрадуктыўных правоў у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь і замежных краінах. Галоўныя адрозненні складаюцца ва ўсталяванні паходжання дзяцей, народжаных з прымяненнем дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, у забароне на ажыццяўленне ў замежных дзяржавах камерцыйнага сурагатнага мацярынства або сурагатнага мацярынства ў цэлым, а таксама ў парадку заключэння дагавора сурагатнага мацярынства.

На падставе кампаратыўнага аналізу матэрыяльна-прававога рэгулявання сурагатнага мацярынства можна зрабіць наступныя высновы:

1) Для фактычных бацькоў беларускае заканадаўства з'яўляецца больш прывабным, паколькі ў адрозненне ад большасці краін – членаў Еўрапейскага Саюза ў Рэспубліцы Беларусь сурагатнае мацярынства дазволена і заканадаўча ўрэгулявана. Пры гэтым дапускаецца толькі гестацыйнае сурагатнае мацярынства (калі генетычная сувязь паміж сурагатнай маці і дзіцём адсутнічае), як на платнай, так і на бязвыплатнай аснове (арт. 1, арт. 20, арт. 23 Закона аб ДРТ) [10]. Абавязковае заключэнне дагавора сурагатнага мацярынства, які падлягае натарыяльнаму засведчанню.

2) Увядзенне патрабавання аб зацвярджэнні дагавора сурагатнага мацярынства судом (як, напрыклад, у штаце Вірджынія), на наш погляд, не адпавядае інтарэсам бакоў дадзеных праваадносін, паколькі вядзе да бюракратызацыі працэсу рэалізацыі сурагатнага мацярынства.

3) У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае прэзумпцыя мацярынства жанчыны, якая заключыла дагавор сурагатнага мацярынства (ч. 5 арт. 52 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і) [11]. Аднак у беларускім заканадаўстве не замацаваны ўзроставыя абмежаванні для фактычнай маці. Грунтуючыся на станоўчым вопыце Грэцыі, прапануем усталяваць у арт. 6 Закона аб ДРТ максімальны ўзрост для фактычнай маці – 50 гадоў. Мэтай увядзення дадзенага абмежавання з'яўляецца забеспячэнне належнага бацькоўскага выхавання дзіцяці (дзяцей), а таксама прафілактыка сіроцтва [12, с. 253];

4) Беручы пад увагу вопыт Казахстана, лічым неабходным дапоўніць артыкул 52 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і часткай шостай наступнага зместу: «У выпадку адмовы жанчыны, якая заключыла дагавор з сурагатнай маці, ад дзіцяці права мацярынства па яе жаданні застаецца за сурагатнай маці, а ў выпадку яе адмовы дзіця перадаецца пад апеку дзяржавы», што дасць магчымасць урэгуляваць адносіны паміж мужам і жонкай і сурагатнай маці ў выпадку адмовы мужа і жонкі ад дзіцяці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Літаратура

1 Анцух, Н. С. Трансграничные проблемы правового регулирования суррогатного материнства: монография / Н. С. Анцух. – Минск: Четыре четверти, 2015. – 156 с.

2 Семейный кодекс Российской Федерации принят Гос. Думой 29.12.1995 N 223-ФЗ [Электронный ресурс] // Консультант Плюс. – Режим доступа: http://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_8982/062dc2e007c56e8d7bef623d85e867a4b0e99a1d/. – Дата доступа: 03.04.2019.

3 Кодекс Республики Казахстан о браке (супружестве) и семье: Кодекс Респ. Казахстан, 26 дек. 2011 г., N 518-IV // ИС ПАРАГРАФ – ЮРИСТ [Электронный ресурс] / ТОО «ИнфоТех&Сервис». – Режим доступа: https://online.zakon.kz/document/?doc_id=31102748#pos=828;-54. – Дата доступа: 07.04.2019.

4 Тимофеева, Т. В. Суррогатное материнство в зарубежных странах: мировой опыт правового регулирования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://izron.ru/articles/aktualnye-problemy-yurisprudentsii-v-rossii-i-za-rubezhom-sbornik-nauchnykh-trudov-po-itogam-mezhdun/sektsiya-3-grazhdanskoe-pravo-predprinimatelskoe-pravo-semeynoe-pravo-mezhdunarodnoe-chastnoe-pravo/surrogatnoe-materinstvo-v-zarubezhnykh-stranakh-mirovoy-opyt-pravovogo-regulirovaniya/. – Дата доступа: 09.03.2019.

5 Трунов, Л. К. Юридические и практические аспекты суррогатного материнства // Юридический Мир // Юридический консультант. – 2004. – №10. – С. 5–10

6 Бурдо, Е. П. Понятие суррогатного материнства и его правовое регулирование / Е. П. Бурдо. // Пробелы в российском законодательстве. – 2014. – № 4. – С. 54–56.

7 Does Surrogacy Involve Making Families or Selling Babies? / V. Singh, P. Thakur, Byasdev, Anjum // International Journal of Healthcare Sciences. – 2014. Vol. 2, iss. 1. April – September. – P. 129–130.

8 Nilsson E. Merit Making, Money and Motherhood: Women’s Experiences of Commercial Surrogacy in Thailand : master thesis in gender studies [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.researchgate.net/publication/296653040_Merit_Making_Money_and_Motherhood_Women's_Experiences_of_Commercial_Surrogacy_in_Thailand. – Date of access: 04.03.2019

9 Русанова, Н. Е. Репродуктивные возможности демографического развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/2009/0365/analit01.php. – Дата доступа: 09.03.2019.

10 О вспомогательных репродуктивных технологиях: Закон Респ. Беларусь, 07 янв. 2012 г. № 341-З [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 09.03.2019.

11 Кодекс Республики Беларусь о браке и семье: Кодекс Респ. Беларусь, 24 июня 1999 г., № 278-З [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 10.03.2019.

12 Басалыга, И. С. Правовое регулирование суррогатного материнства в странах ЕС и Республике Беларусь: компаративный анализ / И. С. Басалыга // Международная конференция «Европейский Союз и Республика Беларусь: перспективы сотрудничества»: сб. материалов. – Минск: Изд. центр БГУ, 2014. – С. 249–253.

**УДК 341.215.4-054.73:342.7-054.73**

***Ю. В. Кавалёва***

## ПРАВАВЫ СТАТУС БЕЖАНЦАЎ У МІЖНАРОДНЫМ І ЎНУТРЫДЗЯРЖАЎНЫМ ПРАВЕ

*Артыкул прысвечаны аналізу асобных нормаў беларускага і міжнароднага заканадаўства, звязаных з рэгуляваннем пытанняў прававога статусу бежанцаў у міжнародным і ўнутрыдзяржаўным праве. Праведзены параўнальны аналіз нормаў міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь з мэтай унясення прапаноў па яго ўдасканаленні.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ